Заключны этап рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах
«Беларуская мова» і «Беларуская літаратура» 2019/2020 навучальны год

ЗАКЛЮЧНЫ ЭТАП XXXVI РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ ПА ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАХ «БЕЛАРУСКАЯ МОВА» І «БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА»

# КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

*Маладзечна 2020 г.*

## *БЛАНК ЗАДАННЯЎ*

**11 клас**
**Варыянт 1**

**Заданне 1.** Утвараючы новыя словы ад дзеяслова ***хадзіць*** пры дапамозе прапанаваных схем, падбярыце да кожнай з іх максімальна адпаведную прыстаўку. Калі падабраная прыстаўка можа выступаць у розных фанетычных варыянтах, запішыце іх усе.

**Заўвага**: для кожнай схемы можна падабраць толькі адну прыстаўку, і яна не павінна паўтарацца ў іншых схемах.

*Максімальная колькасць балаў –* ***6****.*

**Заданне 2.** З прапанаваных ніжэй слоў, ужыўшы іх у патрэбнай граматычнай форме, складзіце шэсць фразеалагізмаў з кампанентамі-прыназоўнікамі, прыведзенымі ў табліцы. Запішыце складзеныя фразеалагізмы ў правым слупку насупраць адпаведных ім значэнняў.

**Словы-кампаненты для складання фразеалагізмаў:** *біцца, бык, гарэць, заклад, зямля, індык, каза, мост, мяняць, нага, пажарны, парадак, паспець, проста, торг.*

*Максімальная колькасць балаў –* ***6****.*

**Заданне 3.** Перакладзіце тэкст на беларускую мову.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

Лениво и бездумно, будто гуляющие без цели, стоят подоблачные дубы, и ослепительные удары солнечных лучей зажигают целые живописные массы листьев, накидывая на другие темную, как ночь, тень, по которой только при сильном ветре прыщет золото. Изумруды, топазы, яхонты эфирных насекомых сыплются над пестрыми огородами, осеняемыми статными подсолнечниками. Серые стога сена и золотые снопы хлеба станом располагаются в поле и кочуют по его неизмеримости. *(По Н. Гоголю)*.

**Заданне 4.** Паводле прыведзеных прыкладаў сфармулюйце магчымыя значэнні прыназоўніка ПРАЗ.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

***Узор:***

| *прыназоўнік* | *прыклады* | *значэнне* |
|---|---|---|
| *З* | Рыбіна важыла з кілаграм. Пражыў з паўгода. Ростам з бацьку. | *Прыблізна, амаль.* |

**Заданне 5.** Уявіце, што Вам трэба скласці тлумачальны слоўнік камп'ютарных тэрмінаў. Сфармулюйце і запішыце тлумачэнні прыведзеных ніжэй слоў і словазлучэнняў.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

***Узор:***

| *словы і словазлучэнні* | *тлумачэнне* |
|---|---|
| *сістэмны блок* | асноўная прылада камп'ютара, якая змяшчае апаратнае і праграмнае забеспячэнне |

**Заданне 6.** Выпішыце ў табліцу словы з арфаграфічнымі памылкамі, запішыце іх без памылкі і патлумачце правапіс.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

Кантрасны, арандаваць, вогнеўстойлівы, дэзінфекцыя, узгалаўе, Мекка, няньчыць, ток-шоў, расольнік, сядзце, рэзюме, абы-хто, дзесяці-працэнтны, працадзень, шмат'ядзерны.

**Заданне 7.** Адзначце, якому стылю (афіцыйна-дзелавому, навуковаму, публіцыстычнаму, гутарковаму) уласцівы наступныя характарыстыкі.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

**Заданне 8.** Складальнікам аднаго з першых айчынных слоўнікаў літаратуразнаўчых тэрмінаў быў Максім Гарэцкі, які ў сваёй "Гісторыі беларускае літаратуры" змясціў раздзел "Назваслоўе". Падумайце, якім літаратуразнаўчым тэрмінам дадзены наступныя азначэнні.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

А. Кірунак у паэзіі, самай навейшай, што ў ім на першы план ставіцца ў творчасці вобраз як каштоўны сам па сабе, як спосаб і мэта творчасці, як тэма і змест.

Б. Тая рэч ці справа, аб якой у творы пішацца. <…> змяшчаецца ў загалоўку, каб адразу было відаць, што чытач знойдзе ў гэтым творы.

В. Род паэзіі. Паэтычныя творы, у якіх аўтар апавядае, малюе, замацоўвае вонкавую для яго рэчавістасць, падзеі і факты (паэмы, раманы, повесці, апавяданні, ідыліі, балады, байкі, казкі, легенды, гістарычныя песні, псальмы). Драма робіць тое ж, <…> але не ад імя аўтара, а праз беспасэрэдную гутарку, праз дыялогі саміх дзеючых асоб.

Г. Від драматычнае паэзіі, сярэдні між трагедыяй і камедыяй. Бытавая – выяўляе змаганне з якой-небудзь асаблівасцю бытавога ўкладу жыцця. Псіхалагічная – змаганне, звязанае з глыбокімі псіхалагічнымі з'явамі. <…>

Д. Літаратурны кірунак, што найперш з'явіўся на пачатку 18-га веку ў Англіі. Ён вызначаўся незвычайнай чуласцю, слязлівай, падсаладжанай навучальнасцю, жаданнем знайсці нейкі асаблівы сэнс і паэзію ў драбніцах штодзеннага, мяшчанскага жыцця.

Е. Драматычны твор, у які для большага ўражання і падкрэслівання некаторых момантаў, размоў, уводзіцца музыка (часта бывае ў п'есах Ф. Аляхновіча); <…> завуцца і такія сцэнічныя творы, звычайна неглыбокага зместу, у якіх многа наўмысных эфектных сцэн і ўсякіх вострых і цяжкіх для гледача сцэнічных эфектаў <…>.

**Заданне 9.** Сёлета споўнілася б 100 гадоў вядомаму беларускаму пісьменніку Міколу Аўрамчыку. Прачытайце яго верш “Ода Каралішчавічам”. Назавіце самыя вядомыя псеўданімы (калі такія ёсць) і прозвішчы пісьменнікаў, якія сабраліся ў Доме творчасці ў Каралішчавічах.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

За баравінамі і такавішчамі,
Куды ў любога – свой пароль,
Ёсць каралеўства – Каралішчавічы,
Дзе кожны сам сабе кароль.
З шпакоўнямі, вавёрак уладаннямі,
Забыты гэты наш Парнас,
Легендамі сваімі і паданнямі
Авеяны цяпер у нас.
Яліна прыдарожная з наростамі
Хавае тую лаўку ў цень,
Дзе Канстанцін Міхайлавіч у роздуме
Любіў адпачываць удзень.
На мураве пляцоўка ёсць квадратная,
Што помніць таварыскі матч,
Дзе спакваля вёў рэй Кандрат Кандратавіч,
Узяўшы валейбольны мяч.
Пад соснамі, нібы пад палісандрамі,
Тут адчаканіўшы радкі,
Яўген Іванавіч з Аркадзем Аляксандравічам
Нас выстаўлялі ў гарадкі.
А ў фінскім доме, за сцяной драўлянаю,
Пергаментны папірус свой,
Як летапісец, Пімен Емяльянавіч
Нашчадкам скручваў у сувой.
Як толькі праспінала поўнач ціхая
Над лесам зорны свой шацёр,
Тут на чале з Міхалам Ціханавічам
Хлапцы запальвалі касцёр.
На досвітку ўставаў Пятрусь Усцінавіч,
Што жыў наводшыбе заўжды,
Ішоў да азярца ляснога з цінаю,
Знікаў няведама куды.
А рана хто ўстае, жыццём разбуджаны,
Таму, як кажуць, Бог дае…
І мы ўставалі, цішынёю спуджаныя,
Тады, як сонейка ўстае.
Каб не праспаць, як зацурчыць струменямі
У жбан салодкі сок з бяроз,
Як салаўі пад першымі праменямі
Здзяўбуць з лістоў зярняты рос.
А хто адгэтуль не вяртаўся з вершамі,
Той бачыў, дзе і ў час які
Тут зацвітаюць такавішчы верасам,
Чуў, як растуць баравікі.

***Узор:***

| *імя, імя па бацьку* | *прозвішча* | *псеўданім* |
|---|---|---|
| Канстанцін Міхайлавіч | *Міцкевіч* | *Якуб Колас* |

**Заданне 10.** Уважліва прачытайце байку Уладзіміра Корбана “Музейны экспанат”. Чаго не хапае ў гэтым творы? Паспрабуйце дапісаць недастатковы кампанент твора, захоўваючы рыфму і агульную ідэйную скіраванасць.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

Апоўначы ў музеі
Калі захроп старэнькі вартаўнік,
Такая здарылася дзіўная падзея, –
Звычайны лапаць лыкавы ўзняў крык:
“Ну хто цяпер сказаць пасмее,
Што я тут кожнаму не брат!
Бо хто я зараз? – Экс-па-нат!
Такі ж, як швейная аршанская машына,
Альбо барысаўскае піяніна,
Ці віцебскі, вядомы ўсім, дыван”.
Ды ў спрэчку мінскі трактар умяшацца
Рашыў і заявіў: “Падман!
Табе няма чым задавацца,
Ты б лепей ужо змоўк.
Вось магілёўскі штучны шоўк
Ляжыць спакойны і маўклівы,
Але якія перспектывы,
Якая будучыня ў яго!
Ого!

***Шыфр*______**

ЗАКЛЮЧНЫ ЭТАП XXXVI РЭСПУБЛІКАНСКАЙ
АЛІМПІЯДЫ ПА ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАХ
«БЕЛАРУСКАЯ МОВА» І «БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА»

# КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

*Маладзечна 2020 г.*

***БЛАНК АДКАЗАЎ***
**11 клас**

| **Заданні** | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | **Усяго** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | | | | | | | | | | | |

**Варыянт I**

**Заданне 1.**

| ***схема*** | ***прыстаўка*** |
|---|---|
|  | |
|  | |
|  | |
|  | |
|  | |
|  | |

**Заданне 2.**

| | | |
|---|---|---|
| *з* | ‘адразу ж, раптоўна, зусім не падумаўшы (рабіць што-н.)’ | |
| *пад* | ‘хто-н. у небяспечным, пагрозлівым становішчы’ | |
| *на* | ‘дзейнічаць, рабіць неабдумана, неабачліва; выбіраць горшае’ | |
| *аб* | ‘спрачацца з абавязкам заплаціць пройгрыш; закласціся ў спрэчцы’ | |
| *у* | ‘даволі спешна, надзвычай хутка (рабіць, зрабіць што-н.)’ | |
| *з + на* | ‘няма чаго спяшацца, не спяшайся’ | |

**Заданне 3.**

**Заданне 4.**

| *прыназоўнік* | *прыклады* | *значэнне* |
|---|---|---|
| ***ПРАЗ*** | Глядзець праз акно.<br>Праязджаць праз вароты.<br>Прадзірацца праз лес. | |
| | Прыехаць праз месяц. | |
| | Паведаміць праз сяброў. Пісаць праз злучок. | |
| | Садзіць кусты праз кожны метр. | |
| | Разышліся праз дробязь. Праз цябе ўсе непрыемнасці. | |
| | Усміхнуцца праз слёзы. Пачуць праз сон. | |

**Заданне 5.**

| *словы і словазлучэнні* | *тлумачэнне* |
|---|---|
| ***электронны адрас*** | |
| ***вірус*** | |
| ***спампаваць*** | |
| ***буфер*** | |
| ***інтэрнэт-крама*** | |
| ***электронны ліст*** | |

**Заданне 6.**

| *слова з памылкай* | *нарматыўнае напісанне* | *правіла* |
|---|---|---|
| | | |
| | | |
| | | |
| | | |
| | | |
| | | |
| | | |
| | | |

**Заданне 7.**

| *характарыстыка* | *стыль* |
|---|---|
| погляды аўтара выражаюць калегіяльныя погляды ўстановы | |
| нязмушаная неафіцыйная асабістая маўленчая камунікацыя | |
| фарміраванне грамадскай думкі | |
| паведамленне новых ведаў і доказ іх сапраўднасці | |
| натуральнасць паводзін падчас камунікацыі | |
| упарадкаванне прававых адносін паміж людзьмі і дзяржавай | |
| адсутнасць прастамоўных і жаргонных слоў | |
| сацыяльная ацэначнасць матэрыялаў | |
| пераважна вусная форма | |
| аб'ектыўнасць, сістэмнасць, лагічная аргументацыя | |
| устанаўленне сацыяльна нарматыўных паводзін | |
| перавага апавядальных сказаў | |

**Заданне 8.**

| *азначэнне* | *тэрмін* |
|---|---|
| **А** | |
| **Б** | |
| **В** | |
| **Г** | |
| **Д** | |
| **Е** | |

**Заданне 9.**

| *імя, імя па бацьку* | *прозвішча* | *псеўданім* |
|---|---|---|
| Кандрат Кандратавіч | | |
| Яўген Іванавіч | | |
| Аркадзь Аляксандравіч | | |
| Пімен Емяльянавіч | | |
| Міхал Ціханавіч | | |
| Пятрусь Усцінавіч | | |

**Заданне 10.**

**У байцы не хапае ___________________________**
**Вось мой варыянт гэтага элемента:**

______________________________________________________________

______________________________________________________________

______________________________________________________________

______________________________________________________________

______________________________________________________________

______________________________________________________________

______________________________________________________________

______________________________________________________________